Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
✉ P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 1 (599)
Студзень 2016 г.



Адзначэньне ўгодкаў Слуцкага Збройнага Чыну

5 сьнежня ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшло сьвяткаваньне Дня Герояў – 95-х угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну, ладжанае супольна Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня" і Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем у Нью-Джэрзі. Напачатку імпрэзы старшыня "Пагоні" Віталь Зайка прывітаў прысутных і распавёў пра пляны і бягучыя справы арганізацыі. Ён прапанаваў прысутным адзначыць хвілінай цішы памяць аднаго з актыўных дзеячаў Згуртаваньня, што адыйшоў у вечнасьць, архіяпіскапа Юрыя (Эмігідыюша Рыжага).

Затым прамоўца павіншаваў усіх з адной са слаўных датаў беларускага нацыянальнага календара. Прамоўца адзначыў, што суполльнае адзначэньне важных датаў у беларускай гісторыі мацуе еднасьць і салідарнасьць беларусаў, што апынуліся далёка ад Бацькаўшчыны, і што праз мацаваньне арганізацыі мы таксама падтрымліваем самых сябе і сваё новае жыцьцё ў Амэрыцы.

Затым з прывітальным словам выступіў старшыня БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрка Азарка. Ён адзначыў, што Дзень Герояў – важная гістарычная дата, якую мусяць помніць і ведаць новыя пакаленьні беларусаў. "Цяпер у Беларусі разганяюць мітынгі ў гонар Слуцкага паўстаньня, але людзі ўсё роўна адзначаюць гэтую дату ў самых неспрыяльных умовах.". Сп. Азарка адзначыў, што адданасьць сваёму народу і мужнасьць робяць Случчакоў адным з найбольш шанаваных герояў-ваяроў у беларускай гісторыі. У Нью-Джэрзі жыло некалькі колішніх удзельнікаў Збройнага Чыну, і штогод іхная памяць ушаноўваецца каля помніка беларускай вайсковай славы на могілках у Іст-Брансўіку, куды людзі прыносяць вянкі й кветкі, а сьвятары БАПЦ адпраўляюць паніхіды за душы супачылых змагароў за вольную Беларусь. Сп. Азарка павіншаваў прысутных і адзначыў, што імпрэзы, як гэтая, мусяць быць больш рэклямаваныя і падрыхтаваныя інфармацыйна, каб на іх прыходзіла штоболей людзей.

Затым з рэфэратам, прысьвечаным 95-м угодкам Збройнага Чыну, выступіў сп. В. Зайка. Ён адзначыў, што гэтая дата адзначаецца па ўсіх беларускіх грамадах на чужыне, але ў самой Беларусі аддаць даніну памяці беларускім героям лічыцца злачынствам! "Горкай ironіяй ёсьць тое, што і дасюль – як і пры саветах, хутка ўжо 100 гадоў будзе – тыя, хто стаіць пры ўладзе ў Беларусі, баяцца памяці пра Случчакоў, надалей забараняюць яе, вынішчаюць, абплёўваюць. І ясна чаму – гэтая ўлада ня ёсьць сапраўдна беларуская.

Прамоўца падкрэсьліў, што падтрымка Случчакоў у 1920 годзе не абмяжоўвалася абшарам Случчыны, але мела месца па ўсёй Беларусі. Сытуацыя, нажаль, склалася не на карысьць беларускіх сілаў, але паўплывала на кансалідацыю іх. Таму сёньня мы з удзячнасьцю ўспамінаем Слуцкіх змагароў і аддаем ім даніну павагі." Прамоўца спыніўся на асноўных гістарычных падзеях, што непасрэдна папярэднічалі Слуцкаму Збройнаму Чыну, згадаў Зьезд Случчыны і выбары яе Рады. Ён дазначыў, што случчакі з энтузіязмам ішлі ў Слуцкую брыгаду, гатовыя са зброяй бараніць сваю зямлю. Калі пачаліся ва-

заканчэньне на бачыне 3



Патрэбная дапамога!

Сашанька – жаданае, першае дзіця. Але, як аказалася і пацьвердзілася генэтычным аналізам, хворы невылечным захворваньнем сьпінальнай цягліцавай атрафіяй Вэрдніга-Гофмана (СЦА).

Сашанька нарадзіўся 8 ліпеня 2008 года, вагою 3920 г і 55 см, закрычаў адразу, быў абсалютова здаровым малым! Бацькі былі шчаслівыя! Але праз месяц у яго зьніклі ўсе рэфлексы і яго адправілі ў абласны шпіталь. Там адразу выказалі здагадку пра жудасны дыягназ, а потым ён пацьвердзіўся генэтычным аналізам! Гэта быў жах ... Сашу выпісалі са словамі, што ён не дажыве і да года!

У 3,5 месяцы ў Сашы прапаў глытальны рэфлекс, яго павезьлі ў шпіталь, дзе сталі карміць праз трубачку. Тады лекары прапанавалі бацьку адмовіцца ад дзіцяці, аднак ён адмовіўся, і сям'я зноў прыехала дахаты. У той жа час бацькі даведаліся пра Беларускі дзіцячы хоспіс, дзе ім дапамаглі і навучылі даглядаць за Сашам. Аднак хвароба прагрэсавала, і ў 6 месяцаў Саша трапіў на апарат ШВЛ (штучнай вэнтыляцыі лёгкіх). Гэта былі ня лёгкія часы для сям'і, бо маці зь дзіцём была ў шпіталі, а бацька пасьля працы імчаўся да іх, потым пад ноч дахаты. Бацькам казалі, што такія дзеткі жывуць і паміраюць у рэанімацыях, але яны хацелі змагацца за сваё дзіця і сталі думаць, як забраць яго дахаты.

У Эўропе дзеткам з такім захворваньнем за кошт страхоўкі купляецца неабходнае абсталяваньне, сям'і прызначаюцца мэдсёстры, якія даглядаюць за хворым. У Беларусі гэтага ўсяго няма. Грошы на апарат ШВЛ давялося зьбіраць усім сьветам. Знайшлося шмат неабыякавых да біды і за 8 месяцаў (маці з Сашам ўвесь гэты час ляжала ў рэанімацыі) бацькі дома падрыхтавалі ўмовы, неабходныя для жыцьця Сашы.

Было вельмі цяжка, бо адсутнічала любая інфармацыя пра тое, што трэба такому дзіцяці дома. Саша быў першым у Беларусі (і як высьветлілася, у Расеі і Ўкраіне), каго забралі з рэанімацыі дахаты. Дома Сашы стала значна лепш.

Сёлета Сашаньку спаўняецца 7 гадоў. Амаль 6 з іх ён жыве дома. З таго часу шмат што зьмянілася: бацькі заўсёды вучацца даглядаць за Сашам, даведваюцца пра розныя навінкі, патрэбныя апараты, яны чакаюць лекі, якія вось-вось будуць, пра якія ўжо ўсе гавораць, што яны сапраўды дапамогуць. Сашанька расьце, а бацькі спрабуюць аблегчыць яму жыцьцё, але хвароба прагрэсуе, ён становіцца слабейшым.

Сашанька ўсё разумее, усё адчувае, але ня можа варушыцца. З-за трахеастомы ён ня можа гаварыць. Бацькі ўвесь час змагаюцца за жыцьцё свайго дзіцяці і будуць змагацца! Але без фінансавай дапамогі гэта зрабіць вельмі цяжка. Жыцьцё дзіцяці залежыць ад шматлікіх апаратаў: дыхае за яго апарат ШВЛ, макроту прыбірае электрапомпа, за пульсам і кіслародам сочыць пульсаксімэтар, пэрыядычна трэба рабіць інгаляцыі. Дзеткі з СЦА маюць адкашлівачы, для Сашы гэта пакуль недазваляльная раскоша, бо каштуе ён каля 6000 эўра.

У апошні час шмат пішуць пра *Tobii*. Гэта свайго роду кампутарная мыш, якая кіруецца вачыма. З дапамогай гэтай прылады чалавек можа працаваць з кампутарам. Дзіця можа гуляць у гульні і разьвівацца. Аднак ад набыцьця гэтай прылады зноў жа спыняе кошт.Падтрымкі з боку дзяржавы для такіх дзетак няма. Усе выдаткі кладуцца на плечы бацькоў, таму прыходзіцца купляць толькі самае неабходнае.

Ужо некалькі разоў тэхніка падводзіла, але, дзякуй Богу, рэанімабіль пасьпяваў своечасова. Потым бацькі купілі запасны апарат ШВЛ, які праслужыў тры гады. З ім яны езьдзілі ў шпіталь, ён кампактна зьмяшчаўся ў калыску, і зь ім можна некалькі гадзін шпацыраваць на вуліцы. Але ён купляўся ўжываным і цяпер выйшаў з ладу. Без запаснога апарату страшна жыць. Стацыянарны апарат вялікі, не зьмяшчаецца ў калыску і зарадкі ў ім хапае толькі на гадзіну. Зь ім магчыма выйсьці толькі на лавачку ля пад'езда.





У сям'і працуе толькі бацька. Маці даглядае Сашку і выхоўвае малодшага брацііка Андрэйку, які нарадзіўся летась.

Тое, што патрэбна для Сашы:

1. Апарат ШВЛ (запасны). Каштуе каля 8000 эўра. На яго зараз зьбіраюць сродкі, засталося каля 2000 эўра.
2. Tobii, кампутарная мыш. Каштуе каля 3000 эўра.
3. Адкашлівач. Каштуе каля 6000 эўра.
4. Мяккія тутора на ручкі і ножкі. Каштуе 650 дал.
5. Мяккі строй-карсэт. Каштуе 220 дал.
6. Гастрастома Kimberly Clark Mic-Key. Каштуе каля 125 дал. (трэба мяняць кожныя 3-4 месяцы)

Калі Вы жадаеце дапамагчы Сашцы, ахвяраваньне можна зрабіць на гэтым сайце:
http://orangepenguin.org/en/projects/hayurov-sasha/

Уладыка ЮРЫ
(Эмігідыюш РЫЖЫ) (1933-2015)



29 лістапада 2015 года перастала біцца сэрца архіяпіскапа Юрыя – чалавека, які прысьвяціў сябе служэньню Богу і Бацькаўшчыне-Беларусі.

Уладыка Юры нарадзіўся 5 жніўня 1933 года ў сялянскай сям'і на хутары ля вёскі Латыгала Пастаўскага павету Віленскага ваяводзтва (цяпер Глыбоцкі раён Віцебшчыны). Ад малых гадоў Эмік, як звалі яго ў сям'і, працаваў з бацькамі на гаспадарцы.

Падчас Другой сусьветнай вайны ягоны бацька Франук Рыжы быў забіты ў 1942 годзе партызанамі за актыўную нацыянальна-патрыятычную дзейнасьць свайго старэйшага сына Ўладыслава. З-за гэта ж і маці Юзэфа атрымала ў 1945 годзе 10 гадоў папраўчых лягероў.

У 1946 годзе 12-гадовы Эмігідыюш разам са старэйшай сястрой Стэфаніяй быў вымушаны выехаць у Польшчу, але фактычна гэта была дэпартацыя. Польскі пэрыяд жыцьця доўжыўся трыццаць гадоў. У цяжкай сялянскай працы прайшло ягонае юнацтва. У 1950 годзе Эмігідыюш Рыжы перабраўся ў Кашалін, затым у Слупск, дзе спалучаў працу з вучобаю ў вячэрняй школе.

Напачатку 60-х гадоў ён атрымаў дыплём інжынэра. Ад таго ж часу жыў у горадзе Ўстка на балтыйскім ўзьбярэжжы і працаваў на розных пасадах ва ўпраўленьні гарадзкога будаўніцтва, падтрымліваў сувязь з нацыянальнымі беларускімі суполкамі Польшчы.

Па запрашэньні брата Ўладыслава ў 1976 годзе Эмігідыюш Рыжы выехаў у ЗША, дзе пражыў усё астатняе жыцьцё. У пачатку 1977 года, адчуўшы Божае пакліканьне, сп. Рыжы паступае ў духоўную сэмінарыю, яго высьвячаюць на сьвятара, і ён далучаецца да душпастырскай справы свайго брата Ўладыслава Рыжы-Рыскага (1925 – 1978), доктара тэалёгіі, заснавальніка і кіраўніка Сусьветнага Амэрыканскага Патрыярхату (АСП) і Беларускай (Народнай) Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, стваральніку Ўнівэрсытэту Народаў Амэрыкі, Інстытуту беларусаведы імя Ільва Сапегі, выдаўца і рэдактара духоўнай пэрыёдыкі, аўтара шэрагу багаслоўскіх працаў і літаратурных твораў.

У 1978 годзе Эмігідыюша Рыжага высьвецілі на япіскапа. Праз паўгода ён быў падвышаны да сана архіяпіскапа. Пасьля сьмерці брата Сабор АСП надаў архіяпіскапу Юрыю тытул Апостальскага адміністратара. Прыходы АСП сёньня існуюць у шэрагу краінаў, але найбуйнейшыя ёсьць у Паўднёвай і Цэнтральный Амэрыцы.

Архіяпіскап Юры – адзін з заснавальнікаў на Бацькаўшчыне духоўнага супраціву маскоўскай рэлігійнай экспансіі. У 1993 годзе ўпершыню пасьля амаль паўвекавога выгнаньня наведаў Беларусь. Затым прыяжджаў на Бацькаўшчыну штогод 10 гадоў запар. З ініцыятывы і пры непасрэдным удзеле Ўладыкі на Бацькаўшчыне пачала дзейнічаць Беларуская (Народная) Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Так, у 1994 годзе пачаліся багаслужбы ў менскай парафіі Сьв. Эўфрасіньні Полацкай, у 1995 г. выходзіць з друку першы нумар царкоўнага інфармацыйнага бюлетэню “Голас Царквы Беларускай”. 1996 год – пераход ва ўлоньне Б(Н)АПЦ парафіі Сьв. Вялікапакутніка Панцеляймона ў Лідзе, пачатак дзейнасьці парафіі і адбудова старажытнага храму ў гонар Найсьвяцейшай Маці Божай у Сёмкавым Гарадку, адкрыцьцё парафіі ў старадаўняй Пакроўскай царкве вёскі Строчычы пад Менскам. У 1997 годзе адчыняе дзьверы парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Слоніме ў новазбудаванай капліцы. У 1999 г. пачаліся набажэнствы і будаўніцтва храму ў парафіі Сьв. Эўфрасіньні Полацкай у пасёлку Пагранічны ў Берастовіцкім раёне на Гродзеншчыне. У 2000 г. утвараюцца царкоўныя суполкі ў Гарадні і Зэльве. У 2002 г. пачынае дзейнічаць парафія Сьв. Юрыя ў вёсцы Шчомысьліца Менскага раёну. Нажаль, сёньня бальшыня гэтых беларускіх хрысьціянскіх асяродкаў зьнішчаная ўладамі.

Апошні раз архіяпіскап Юры наведаў Беларусь у ліпені 2013 года, дзе, акрамя сустрэч зь вернікамі, браў удзел у працы VI Зьезду беларусаў сьвету. У кастрычніку 2014 году адбыўся ягоны апошні архіпастырскі візыт. Ён наведаў аднаверцаў зь Беларускай Славянскай Праваслаўнай Царквы ў Аргентыне.

У 2003 годзе выйшла з друку кніга ўспамінаў і развагаў архіяпіскапа Юрыя “Мой крыж”. У альманаху “Беларус” надрукаваны шэраг ягоных апавяданьняў.

Архіяпіскап Юры заўсёды займаў актыўную грамадзкую пазіцыю, быў радным Рады БНР, сябрам Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, выбіраўся сябрам управы арганізацыі. Калі Нью-Ёрскі аддзел быў змушаны пакінуць БАЗА, архіяпіскап Юры стаў адным з заснавальнікаў і актыўным сябрам новай арганізацыі – Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”.

Выказваем спачуваньні родным і блізкім спачыўшага. Вечная яму памяць, і няхай Госпад Бог прыме ў супакоі ягоную душу.

95-я ўгодкі СЗЧ

заканчэньне з бачыны 1

енныя дзеяньні супраць наступаючых бальшавікоў, баі вызначаліся моцнай зацятасьцю, некаторыя населеныя пункты ня раз пераходзілі з рук у рукі. Случчакі больш за месяц стрымлівалі пераўзыходзячыя сілы добра ўзброенага, загартаванага ў папярэдніх баях расейскага войска.

Падзеі Слуцкага Збройнага Чыну назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю, хоць гісторыя гэтая, сапраўдная гісторыя Беларусі, дасюль схаваная ад народу. Ахвярнасьць Случчакоў – яскравае сьведчаньне нязгаснага імкненьня беларусаў да незалежнасьці, яго рашучасьці ў змаганьні за яе.

Затым адбыўся канцэрт паэта і сьпевака Сяржука Сокалава-Воюша. Ён выканаў свае творы, прысьвечаныя героям-Случчакам, а таксама вядомыя творы з цыклю “Песьні Лісоўчыкаў”, а таксама іншыя патрыятычныя і лірычныя песьні: “Беларусь мая”, “Чароўная Ганна” ды іншыя. Сьпевы былі з захапленьнем успрынятыя прысутнымі.

Потым удзельнікі імпрэзы маглі адначыць Дзень Герояў за кілішкам віна са сьціплымі пачастункамі.

Віталь ЗАЙКА

“Галгатня пра ЗыШыА”

Наш “second amendment”

За што можна не любіць “вышыванку”? Самы просты адказ – за тое, што яна беларуская. Па камэнтарах бачна, што перашкаджае яна найбольш менавіта тым, хто аніякім чынам ня можа ідэнтыфікаваць сябе зь беларускай культурай. Але гэта не адзіныя апанэнты вышыванкавай ідэалёгіі. Многім перашкаджае не вышыванка, а ўзровень прапанаваных прадуктаў і самой дыскусіі вакол гэтай часткі народнай культуры і тое, што яна зводзіцца да элемэнту попкультуры. Ад масавасьці, вядома, пакутуе любая, нават самая шляхетная задума. Кітайскія майкі з прынтамі арнамэнтаў ня могуць цешыць нікога, хто хоць раз на ўласныя вочы бачыў рукатворныя строі ў палескіх вёсках, ды і нікога нават зь мінімальным пачуцьцём густу. Для некага, хто дасьледуе тэму навукова, як Вольга Лабачэўская, зьвядзеньне арнамэнтаў да паасобных знакаў цалкам непрымальнае. Гэты ўзор – сымбаль каханьня, а гэты – сымбаль сям’і, як у кніжцы М. Кацара – гэта сапраўдная прафанацыя. Такое спрашчэньне неверагодна складанай па сваёй сутнасьці сэмантыкі беларускага арнамэнту, дасьледчыца параўноўвае з культурным генацыдам і мае рацыю. Падобныя тэндэнцыі, зрэшты, закранулі ня толькі нацыянальныя арнамэнты, але таксама беларускую мову, беларускі фальклёр і спосаб падачы нацыянальнай культуры ў цэлым. Часта гэта адбываецца пры поўнай несьвядомасьці “модных” мэнэджэраў пра шкоднасьць такой дзейнасьці.

А яшчэ вышываначны бум можна не любіць за некамплектнасьць. Для паўнавартаснасьці нацыянальнаму строю як паветра не хапае, магчыма, асноўнага элемэнту – зброі. Ці можа хто-небудзь уявіць сабе амэрыканскага каўбоя без рэвальверу? Чым быў бы тэхаскі рэнджэр у каўбойскім капелюшы, але без сваёй стрэльбы? Як выглядаў бы індзеец у характэрным галаўным уборы зь пер’я, але без галоўнага атрыбуту кожнага індзейца – луку і стрэлаў? Хіба выключна “талерантнаму” беларусу дазволеныя толькі лапці і саламяныя брылькі? Калі ад злых духаў і чорнага вока яго засьцерагуць



Глыбоцкі майстар па дрэву Віктар Дудкевіч

адпаведна разьмешчаныя арнамэнты на каўнярах і рукавах, то хто засьцеражэ ад бачных ворагаў? Беларус-ліцьвін, заўсёды быў ваяром. Дасьледчык Зьдзіслаў Сіцька нават мяркуе, што ліцьвінства было нечым накшталт ваеннага стану, падобнага крыжацкаму закону. Таму безумоўна, што для паўнаты нацыянальнага вобразу бракуе паляўнічага нажа, шаблі або двустволкі. Тут адкрываецца цэлае поле для рэканструктараў і майстроў гістарычнай зброі.

Бо без халоднай і агняпальнай зброі ды таксама і без выдатных навыкаў у карыстаньні імі беларус рызыкуе так і застацца плеценым лапцем або наклейкай на кітайскай майцы.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

Ю. Малахаў **60**
У. Панасік **60**
А. Сяргеенкава **60**

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя скарбніка
Viktar Yedzinovich.

*Паважаныя **Сяргей Козыраў, Крысьціна Штымак і Яраслаў Яджак,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **9-га студзеня 2016 года** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля сходаў на 2-м паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

В. Кіпель **30**
У. Панасік **30**
А. Пранцэвіч **30**
А. Сяргеенкава **30**

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні” **Viktar Yedzinovich**.*

*Падпіску таксама можна афроміць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку **www.e-krama.com***